## Прэзентацыя архіва Міхала Клеафаса Агінскага

**6 лютага 2008 г.** у Мінску ў Дзяржаўным музеі гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь адбылася прэзентацыя архіва Міхала Клеафаса Агінскага, які захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў, куды ў 1833 г. яго перадаў сын кампазітара Ірэніюш.

Творчая спадчына М.К.Агінскага з'яўляецца неад'емнай часткай беларускай культуры. Архіў уключае 5912 лістоў.

Вяртанне архіва стала магчымым пры фінансавай падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве і па ініцыятыве Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Перамовы і ўсю падрыхтоўчую працу па выяўленні і вяртанні архіва ўзяў на сябе Дзяржаўны музей гісторыі тэатральнай і музычнай культуры Рэспублікі Беларусь

Атрыманы архіў будзе выкарыстаны пры стварэнні музейнай экспазіцыі пасля рэстаўрацыі сядзібы М.К.Агінскага ў вёсцы Залессе, навукоўцамі пры даследаванні творчасці М.К.Агінскага.